2. *Функ, Я. И.* Безвозмездные договоры в правовой системе Республики Беларусь: договор пожертвования, договор безвозмездного выполнения работ (оказания услуг), договор беспроцентного займа / Я. И. Функ // Главный Бухгалтер. — 2006. — № 41. — С. 36–38.

3. Налоговый кодекс Республики Беларусь (особенная часть) [Электронный ресурс] : 29 дек. 2009 г., № 171-З : в ред. Закона Респ. Беларусь от 09.01.2017 г. № 15-З // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. — Минск, 2009.

***Д.В. Рублеўская***
*БДЭУ (Мінск)*
*Навуковы кіраўнік* ***І.У. Вішнеўская*** *— канд. гіст. навук*

# ПАЛІТЫЧНЫЯ ПРАВЫ ШЛЯХТЫ ВКЛ Ў ПРЫВІЛЕЙНЫ ПЕРЫЯД

Прывілейны перыяд права на тэрыторыі Беларусі ахоплівае XIV — пачатак XVI ст.ст. і мае ў сваім складзе шмат нарматыўна-прававых актаў, якія з’яўляюцца важнымі галінамі права. Што датычыцца тэмы шляхецкага прававога становішча, то ў дадзеным перыядзе яно замацоўвалася агульназемскімі прывілеямі (граматамі).

Першым заканадаўчым актам, які зацвярджаў палітычныя правы шляхцічаў, можна лічыць тры граматы, якія ў наступным юрыдычна аформілі Гарадзельскую ўнію 1413 г. У трэццяй грамаце змяшчаўся шэраг дыскрымінацыйных артыкулаў, але ў дадзенай працы акцэнт будзе зроблены на некаторыя з іх: у параграфе трэцім, напрыклад, гаварылася, што толькі каталікі могуць валодаць і карыстацца прывілеямі пануючага саслоўя з боку вярхоўнай улады; у шостым параграфе былі змешчаны забароны на шлюбы паміж каталікамі і праваслаўнымі; а дзявяты параграф устанаўліваў, што на “дастоінства, месцы і пасады” прызначаліся “толькі каталіцкай веры прыхільнікі і падуладныя святой Рымскай царкве”.

Такім чынам, з цягам часу ўсе больш увагі надавалася пытанням менавіта палітычнага становішча шляхты. Гэта было звязана з тым, на маю думку, што шляхецкае саслоўе ўжо знаходзілася на такім этапе свайго развіцця, калі ўжо трывала займала свае месца ў іерархіі палітычнага ладу ВКЛ.

Наступны заканадаўчы акт ВКЛ быў выдадзены каралем і вярхоўным князем ВКЛ Ягайлам ў Гародзі 15 кастрычніка 1432 г. пад час грамадзяскай вайны 1432–1435 гг. Гэты Прывілей ураўноўваў у асабістых і маемасных правах праваслаўных князёў з феадаламі-каталікамі.

Наступным заканадаўчы акт — Прывілей Вялікага князя Літоўскага Казіміра 1447 года пацвярджаў асабістую свабоду і недатыкальнасць баяр, гарантаваў, што за правіннасць павінен адказваць толькі сам вінаваты. У дадзеным акце зацверджана права судовага імунітэту і змяшча-

ецца такая норма, якая гарантавала, што землі і дзяржаўныя пасады ў ВКЛ будуць атрымліваць толькі ўраджэнцы ВКЛ.

Яшчэ больш пашырыў правы Прывілей ВКЛ Аляксандра 1492 года, які ўстанавіў, што вялікі князь не мае права адмяняць або змяняць законы, пастановы і судовыя рашэнні, прынятыя разам з радай, якая складалася са шляхты. Рада дзейнічала пад кіраўніцтвам вялікага князя, але ў выпадку яго адсутнасці самастойна вырашала пытанні агульнадзяржаўнага значэння.

З мэтай далейшага пашырэння палітычных і саслоўных правоў шляхты вялікім князем ВКЛ Жыгімонтам Аўгустам 1 ліпеня 1564 г. быў прыняты Бельскі прывілей, згодна якому ўтвараліся выбарныя шляхецкія саслоўныя суды, аддзеленыя ад велікакняжацкай адміністрацыі, абвяшчалася роўнасць шляхты перад судом і законам.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што развіццё і пашырэнне правоў шляхты уяўляла сабой павольны працэс заканадаўчага замацавання правоў у Прывілеях. Робячы вынікі гэтага этапа развіцця права, трэба адзначыць, што XIII — канец XIV ст.ст. сталі перыядам фарміравання адзінага класа-саслоўя феадалаў — шляхты.

**Літаратура**

1. *Сагановіч, Г.* Нарыс гсіторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст. / Г. Сагановіч. — Мінск : Энцыклапедыкс, 2001. — 412 с.

2. *Юхо, Я. А.* Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : вучэб. дапам. : у 2 ч. / Я. А. Юхо. — Мінск : РІВШ БДУ, 2000. — Ч. 1. — 352 с.

3. *Вішнеўскі, А. Ф.* Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : вучэб. дапам. / А. Ф. Вішнеўскі. — Мінск : Экаперспектыва, 2000. — 319 с.

***В.П. Сухопаров***
*БГЭУ (Минск)*
*Научный руководитель* ***Д. М. Демичев*** *— д-р юрид. наук*

## МОЖЕТ ЛИ ЧЕЛОВЕК БЫТЬ ОБЪЕКТОМ ПРАВООТНОШЕНИЯ?

Изучение понятия «человек» в юриспруденции тесно переплетается с изучением субъектов правоотношений. Вместе с тем в юридической науке не решен вопрос: может ли человек быть объектом правоотношения?

Белорусский ученый В.А. Кучинский, ссылаясь на ст. 2 Конституции Республики Беларусь, пишет, что, поскольку «объектами правоотношений являются ценности (блага)», человек как высшая ценность является объектом правоотношения [1], однако такой аргумент в пользу признания человека объектом правоотношения едва ли можно считать убедительным, ведь упомянутая конституционно-правовая норма